


САМАЯ ПОЎНАЯ ТЭЛЕПРАГРАМА НА ТЫДЗЕНЬ: 31 КАНАЛ

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9 СНЕЖНЯ 2011 г.
ПЯТНІЦА
№ 235 (27099)
Кошт 800 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## БЕЛАРУСЬ ПАЦВЯРДЖАЕ ГАТОЎНАСЦЬ СУПРАЦОЎНІЧАЦЬ З ЗАМЕЖНЫМІ ІНВЕСТАРАМІ Ў РАСПРАЦОЎЦЫ КАЛІЙНЫХ РАДОВІШЧАЎ

**Беларусь не спяшаецца з прыватызацыяй «Беларуськалія», але пацвярджае гатоўнасць супрацоўнічаць з замежнымі інвестарамі ў распрацоўцы калійных радовішчаў. Аб гэтым 8 снежня заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на нарадзе па пытанні развіцця калійнай галіны, у ходзе якой былі разгледжаны вынікі і перспектывы работы акцыянерных таварыстваў «Беларуская калійная кампанія» і «Беларуськалій», паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

«Гаворачы аб прыватызацыі «Беларуськалія», я хачу сказаць, што мы тут абсалютна не спяшаемся. Нам не трэба прадаваць гэта прадпрыемства, ні адну акцыю, ні дзве, ні дзесяць, ні ўсе 100 працэнтаў, — заявіў Прэзідэнт. — Таму, калі хтосьці пачынае вішчаць, што вельмі высокая цана, ніхто ў беларусаў не купіць па такой цане «Беларуськалій», то і не трэба. Я хачу, каб гэта ведалі і нашы шахцёры».

Што датычыцца кошту прадпрыемства, кіраўнік дзяржавы пацвердзіў, што ён ужо вызначаны і складае мінімум $30 млрд. «Хто жадае ўдзельнічаць у набыцці акцый гэтага прадпрыемства — калі ласка, будзем весці з вамі дыялог», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Радовішчы сільвінітавых руд — нацыянальны здабытак. Але гэта не значыць, што для паскарэння развіцця галіны мы не можам выкарыстоўваць замежны капітал, прыцягнуць інвестара, які мае самыя сучасныя перадавыя тэхналогіі. Тым больш што ёсць нямала буйных кампаній, якія прапануюць свой удзел у гэтым», — адзначыў Прэзідэнт.

«Любы жадаючы інвеставаць сродкі можа прыняць удзел у конкурсе на сумесную работу па здабычы і перапрацоўцы калійных угнаенняў. Сумеснае ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва мы толькі вітаем», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

СТАР. 2

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ ДЗМІТРЫЯ МЯДЗВЕДЗЕВА З ПЕРАМОГАЙ «АДЗІНАЙ РАСІІ» НА ВЫБАРАХ У ДЗЯРЖДУМУ

**Прэзідэнт Беларусі павіншаваў Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі ў сувязі з перамогай Усерасійскай палітычнай партыі «Адзіная Расія», спіс якой на выбарах дэпутатаў Дзяржаўнай Думы Федэральнага Сходу шостага склікання ўзначаліў Дзмітрый Мядзведзеў. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Аляксандр Лукашэнка выказаў глыбокае перакананне, што плённае ўзаемадзеянне парламентаў дзвюх краін будзе садзейнічаць актыўнаму развіццю беларуска-расійскіх адносін, у аснове якіх ляжыць непарушная дружба і духоўная роднасць брацкіх народаў.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «Надышоў час вырашыць пытанне з членствам Узбекістана ў АДКБ»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка лічыць, што надышоў час разгледзець пазіцыю Узбекістана па асобных напрамках дзейнасці АДКБ і вырашыць пытанне з далейшым членствам гэтай краіны ў арганізацыі. Аб гэтым кіраўнік беларускай дзяржавы заявіў 8 снежня, сустракаючыся ў Мінску з генеральным сакратаром Арганізацыі Дагавору аб калектыўнай бяспецы (АДКБ) Мікалаем Бардзюжам, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

«Засталося некалькі дзён да правядзення, я лічу, вельмі сур'ёзнага пасяджэння Савета калектыўнай бяспекі, дзе мы павінны разабрацца з шэрагам унутраных праблем, найперш — звязаных з пазіцыяй Узбекістана па асобных пытаннях. Ад гэтага ўжо нікуды не дзенешся, аб гэтым усе ведаюць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Беларусь цяпер старшынствуе ў АДКБ. Аляксандр Лукашэнка ў сувязі з гэтым адзначыў, што неабходна сфарміраваць асноўны парадак дня Савета калектыўнай бяспекі, запланаванага на 20 снежня.

Генеральны сакратар АДКБ у сваю чаргу падкрэсліў, што год пад старшынствам Беларусі «быў адным з самых выніковых». «Тыя прыярытэты, якія выпрацавала Беларусь і якія на працягу года рэалізоўвалі ў арганізацыі, далі вельмі значны імпульс развіццю АДКБ».

Мікалай Бардзюжа далажыў аб тым, як ідзе падрыхтоўка да пасяджэння Савета калектыўнай бяспекі, а таксама па рэалізацыі дамоўленасцяў, дасягнутых прэзідэнтамі 12 жніўня ў Астане.

Павіншуйце
Вашых партнёраў
з Новым годам і Калядамі!
Сэрвіс друку
НАВАГОДНІХ
фірменных ПАШТОВАК
InterPrint.by
офіс (017) 298 41 68
МТС (029) 775 57 18
Мабільныя тэлефоны SNAMI® SNAMI.BY
ООО «ТЦ СНАМИ» УНП 100705382



Фота БЕЛТА.

Пра яго ўсе гавораць, асабліва сёння, калі адзначаецца 120-годдзе паэта. Яго ўсе любяць. Прынамсі, ніводнага разу не даводзілася чуць адваротнага ад каго б то ні было. Яго ведаюць з дзяцінства — са школы, дзе вучылі на памяць радкі вершаў Багдановіча. Праўда, гэтыя вершы самі на памяць кладуцца. І ўсплываюць у самыя важныя моманты: «Помніш, калі я спаткаўся з табою...»? Ці «Мне доўгае расстанне з Вамі чарней ад Вашых чорных кос...» А то яшчэ песні са знаёмымі словамі пачуюць ды «згадаюць усё, што сэрцу міла...». А наконт таго, што «цвяток радзімы васілька» нават сумневу ні ў каго не ўзнікае: ён і ёсць наш ненавязлівы і сціплы негалосны сімвал зямлі. Зрэшты, сімвалы радзімы нашай Багдановіч адчуваў, бачыў і ўяўляў абсалютна жывымі. Само паняцце радзімы для яго было больш жывое, чым нават асабістае жыццё, якое (ён ведаў) скончыцца...

# ВЫБАР БАГДАНОВІЧА,

## альбо Як разумець Максіма нашым сучаснікам?

УСЕ ГЭТА ВЕДАЮЦЬ. І маюць выбар — як жыццём распарадзіцца. Выбар быў і ў Багдановіча. І цяпер, ведаючы яго лёс і ўяўляючы жыццёвыя магчымасці, якія ў яго маглі б быць, давайце паспрабуем уявіць выбар Багдановіча з пункту гледжання сучаснага беларуса. Ён жа ствараў дзеля будучыні — дзеля нас з вамі. Больш за 100 гадоў прайшло. Ці гатовы мы разумець свайго паэта цалкам — чыста па-чалавечы? У чым мы падобныя, ці не падобныя на яго?

Уявіце: юнак, які жыве ў Расіі, чамусьці ўзгадвае свае карані і вырашае пачаць размаўляць так, як на радзіме. На мове, незразумелай (і калі пераводзіць на сучасныя рэаліі, то абсалютна «не моднай») там, дзе ён жыў. Дзівак?! Захацеў быць арыгінальным ці вылучыцца сярод аднагодкаў — сказалі б зараз. І спагадліва б дадалі: у хаце сярод блізкіх можна і па-свойму паразмаўляць. У нас цяпер усё рацыянальна. Адны словы для сваіх, іншыя — для людзей. А то і наогул — толькі іншыя... У адрозненне ад яго — адваротны працэс назіраецца ў сучасных беларусах, імкненне не ДА мовы, а імкненне АДмовы... Мы б Максіма сёння зразумелі?

Напэўна, адчуваўся ўплыў бацькі Максіма, які захапляўся беларускім фальклорам. Але ж сын пайшоў далей. На беларускай мове ён не толькі размаўляць хоча, але і пачынае пісаць. Вершы ў юнацтве — натуральная справа. Вастрыня пачуццяў, адкрыццё свету, якім хочацца захапляцца. Ці не кожны хоць бы разок паспрабаваў рыфмаваць радкі... А ў юнага Багдановіча яшчэ прыклад Максіма Горкага перад вачыма, які ўзышоў на расійскі літаратурны алімп (сям'я з ім была знаёмая). Можна было марыць пра вялікую літаратуру, якая да таго часу самасцвердзілася ў свеце і на пачатку XX стагоддзя шукала новыя тэмы. Літаратары карысталіся там павагай, былі сапраўды моднымі, гуртавалі вакол сябе эліту...

Максім Багдановіч ідзе ў літаратуру. Ён прыходзіць у тую літаратуру, якой для многіх яшчэ не было, якую лічылі правінцыйнай і не надта імкнуліся зразумець. А ён ужо тады думае пра тое, што калі ёсць асобны народ, то і свая літаратура ў яго павінна быць. Новая беларуская літаратура прарывалася да чытача са старонак «Нашай нівы», імкнучыся стварыць асяроддзе з тых, каму не абыякавая будучыня народа, з адметнай культурай, непадобнай на суседнія. Гэта была праца дзеля ідэі, дзеля высокіх думак і сваіх лепшых мар, у якія яны не тое што верылі — яны працавалі на іх здзяйсненне, не дазваляючы сабе думкі, што можа не атрымацца. Працавалі за ідэю, не чакаючы хуткіх вынікаў. Тым больш — узнагароды...

Але праз сто гадоў мы ж ведаем, што мары на тое і мары, каб не здзяйсняцца (можа, ад таго, што мы дапускаем такія думкі, яны і не здзяйсняюцца?). Мы жывём у рэальнасці і ведаем, што працаваць трэба, каб выжыць. А ці думаў пра гэта ён: хворы, замест таго, каб кінуць усё і ратаваць жыццё, прыкласці намаганні, каб упарта і мэтанакіравана лячыцца, захоплена займаўся творчасцю... Ці зразумелі б мы сёння Максіма, які быў рэальным чалавекам (а не героем з кніг) са здольнасцю не шкадаваць сябе, з імкненнем працаваць на ідэю; ці паверылі б сёння ў тое, што такое магчыма? Хутчэй за ўсё, мы б сталі шукаць, што гэта яму дае. І хутчэй за ўсё, думалі б пра матэрыяльнае... Ці паверылі б, што самай галоўнай узнагародай для яго быў выхад твораў, выданне таго ж «Вянка», які стаў адзіным зборнікам, што ўбачыў свет пры жыцці паэта?

Ці вось яшчэ адзін момант з біяграфіі, які здаецца неверагодным асабліва зараз: жывучы ў цэнтры Расіі, дзе выспявалі грандыёзныя падзеі, ўжо тады і подых іх адчуваўся, ён, будучы вельмі цікаўным і неабыякавым маладым чалавекам, скончыўшы юрыдычны ліцэй, едзе ў Мінск. У Беларусь, якую ў тагачаснай Расіі лічылі глухой правінцыяй імперыі. Ён не лічыў — і не меркаванне іншых, а яго ўласнае перакананне было вызначальным. Яго ўласнае жаданне быць карысным там, дзе яго народ шукаў шлях самавызначэння. Максім любіў краіну, якой яшчэ не было, і гатовы быў працаваць дзеля яе.

Мы маем краіну. Але на што мы гатовы дзеля яе? І ці можам разумець сёння тых, хто мог, імкнуўся, рабіў? Ці хоць бы дзеля павагі да іх гатовы захоўваць тое, што выпястоўвалася, заяўлялася, сведчылася, гадавалася пакаленнямі таленавітых людзей, якія дагэтуль прыклад і вяршыня асоб з сапраўднай нацыянальнай эліты? Такіх, як Максім Багдановіч.

Ён быў і застаўся маладым чалавекам. Пра такіх сёння сказалі б: юнацкія мары, адарваныя ад зямлі, не маюць дачынення да жыцця. Нічога, пажыве, зразумее, што да чаго... Але пасля яго яны засталіся — і перамаглі. Маладыя мары могуць быць вельмі моцнымі, калі людзі не гатовы адмаўляцца і прыстасоўвацца да рэчаіснасці. Тады рэчаіснасць мяняецца. І ствараюцца краіны. Беларусь — гэта краіна мар Багдановіча. Але нам ёсць яшчэ над чым працаваць. Давайце пашукаем падказак у паэта.

...Так, мы вывучалі яго біяграфію. Ведаем: памёр маладым, у росквіце таленту. Паспеў мала... Але вось дзіва: пры тым, што дакладна ведаю, што яго жыццё скончылася ў 25, у маёй свядомасці Максім Багдановіч уяўляецца сур'ёзным чалавекам з багатым жыццёвым досведам, бадай што мудрацом. Можа, таму, што на большасці выяў, помнікаў ён выглядае стрыманым, сумным сталым мужчынам. Ці таму, што словы яго нараджаліся мудрасцю сэрца, яго вобраз падавалі такім? Але сутнасць Багдановіча, напэўна, у тым, што ён за дзесяцігоддзе стварыў на стагоддзі, у той час як дзесяцігоддзяў творчасці для асэнсавання можа хапіць на адзін дзень...

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

*(Працяг тэмы на 6-й стар.)*




## Галоўным трэнерам нацыянальнай зборнай па футболе прызначаны Георгій Кандрацьеў



**Галоўным трэнерам нацыянальнай зборнай Беларусі па футболе прызначаны 51-гадовы беларускі спецыяліст Георгій Кандрацьеў. Пра гэта паведамілі ўчора на пасяджэнні выканкама Беларускай федэрацыі футбола.**

Дагэтуль апошнім месцам працы вядомага спецыяліста была алімпійская зборная Беларусі, з якой на чэмпіянаце Еўропы-2011 Георгій Пятровіч заваяваў пуцёўку на Алімпіяду ў Лондан. Зараз Кандрацьеў будзе спалучаць працу з абедзвюма камандамі. Яго памочнікамі ў нацыянальнай зборнай стануць Андрэй Сацункевіч, Вячаслаў Акшаеў і Дзмітрый Касёнак.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

Жыллё

## СТАЛІЧНЫЯ КВАТЭРЫ ПАТАННЕЮЦЬ ЯШЧЭ НА 7—10 ПРАЦЭНТАЎ

**Такое меркаванне выказаў карэспандэнту «Звязды» кіраўнік агенцтва «БелЦТН» старшыня савета Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалай Прасталупаў**

### Апошняя хваля сезоннай актыўнасці

Эксперты рынку адзначаюць, што сёлета толькі ў лістападзе павысілася актыўнасць пакупнікоў жылля. Да гэтага часу патэнцыяльныя кліенты больш увагі надавалі першаснаму рынку жылля, дзе існавала магчымасць заключаць дагаворы з забудоўшчыкамі па адносна зразумелых цэнах. А вось у лістападзе колькасць рэальных здзелак павялічылася менавіта на другасным рынку жылля. Людзі і зараз набываюць кватэры, аднак актыўнасць пачала зніжацца.

Мікалай Прасталупаў упэўнены, што пасля 20—25 снежня і потым, ажно да сярэдзіны студзеня на другасным рынку жыллёвай нерухомасці ўсталюецца мёртвы сезон. У гэты час купляюцца ці прадаюцца толькі кватэры, дамоўленасці па якіх былі раней.

### Маленькія аднапакаёўкі каштуюць да $40 тысяч

Паводле звестак інфармацыйнага каталога спецыялізаванага выдання «Нерухомасць Беларусі», сярэдні кошт прапановы квадратнага метра агульнай плошчы аднапакаёвых кватэр зменшыўся за мінулы тыдзень усяго на адзін долара і склаў 1371 USD. Прыкладна на такім узроўні трымаецца і кошт жыллёвага «квадрата» двухпакаёвых кватэр.

Самыя танныя аднапакаёвыя кватэры прапануюцца кліентам цяпер за 35—38 тысяч долараў. Гэта зусім маленькія кватэры агульнай плошчай да 33 квадратных метраў у старых дамах Заводскага раёна і Шабаноў. Увогуле, прапанова такіх танных кватэр коштам да 40 тысяч долараў зараз даволі ўнушальная — у базе звестак можна знайсці больш як 100 варыянтаў. А вось самая вялікая прапанова прыпадае на дыяпазон ад 40 да 50 тысяч долараў. Аднапакаёвых кватэр даражэй за 65 тысяч долараў у продажы ўвогуле амаль няма. Якасныя і элітныя аднапакаёўкі ў час крызісу гаспадары мабыць вырашылі пакуль не прадаваць.

Зусім слабенькія двухпакаёвыя кватэры агульнай плошчай 40—45 квадратных метраў каштуюць цяпер 42—47 тысяч долараў. Крыху лепшыя па якасці і месцазнаходжанні кватэры такіх памераў могуць прапаноўвацца і за 50—55 тысяч долараў. Самая вялікая колькасць варыянтаў стандартных двухпакаёвых кватэр агульнай плошчай да 53 квадратных метраў каштуе ўжо да 60—63 тысяч долараў. Існуе вялікая прапанова двухпакаёвак з цэннікам і ў межах 70—80 тысяч долараў, аднак попыт на такое жыллё сёння мінімальны.

Мацней за ўсё таннелі ў апошні месяц шматпакаёвыя кватэры. Толькі за апошні тыдзень трохпакаёвыя кватэры ў сталіцы «згубілі» адразу некалькі працэнтаў, бо за гэты час сярэдні кошт квадратнага метра такога жылля патаннеў адразу на 15 долараў. Рэальныя цэннікі немаладых шматпакаёвых кватэр складаюць у межах 1100—1150 долараў за квадратны метр агульнай плошчы. Разам з тым, нават па такім кошце на рынку вялікія кватэры цяпер амаль не купляюцца.

### Забудоўшчыкі аб'яўляюць аб масавых зніжках

Менавіта гэтымі днямі амаль усе камерцыйныя забудоўшчыкі, якія займаюцца долевым будаўніцтвам жылых дамоў, прапануюць сваім патэнцыяльным кліентам сур'ёзныя зніжкі ў памеры да 10 працэнтаў. Гэтая прапанова дзейнічае да пачатку наступнага года. Так, кватэры ў дамах комплексу «Брылевічы» ад арганізацыі «Арэса-сэрвіс» прапануюцца па цэнніку квадратнага метра ў межах ад 1000 да 1150 долараў. А вось у жылым комплексе «Маяк Мінска», які рэалізуецца ў раёне Нацыянальнай бібліятэкі, кошт квадратнага метра кватэр складае ўсяго ад 900 долараў.

Мікалай Прасталупаў упэўнены, што амаль усе камерцыйныя забудоўшчыкі будуць вымушаны прадаваць кватэры, дзе жыллёвы «квадрат» каштуе да тысячы долараў. Справа ў тым, што ў сённяшніх эканамічных умовах продаж новых кватэр істотна знізіўся, а ў асобных забудоўшчыкаў даволі шмат кватэр у новых дамах ужо «завісла» на 2—5 месяцаў.

### Другасны рынак будзе звужацца і... таннець далей?

Мікалай Прасталупаў упэўнены, што ў снежні і студзені кватэры будуць таннець і надалей. Істотнае зніжэнне ўзроўняў даходаў насельніцтва ў доларавым эквіваленце павінна паўплываць на кошт будаўніцтва жылля і на цэннікі «ўжо немаладога» жылля. Павелічэнне стаўкі рэфінансавання да 45 працэнтаў гадавых аўтаматычна павялічыць працэнтныя стаўкі і па камерцыйных крэдытах пад жыллё. Без крэдытаў масавага пакупніка на другасным рынку жылля не будзе. Атрымліваецца, што попыт на жыллё зменшыцца, а таму яно і пачне таннець. Гэта толькі адзін момант. Аднак існуе і другі бок сітуацыі...

У краіне афіцыйна аб'яўлена аб сур'ёзным зніжэнні аб'ёмаў будаўніцтва жылля на тэрыторыі Беларусі. Так, перад будаўнічай галіной кіраўніцтвам краіны пастаўлена задача больш актыўна заваёўваць замежныя рынкі. Ужо цяпер айчынныя будаўнічыя комплексы атрымалі высокадаходныя заказы ў Ленінградскай, Маскоўскай, Смаленскай і іншых абласцях Расіі. У Мінбудархітэктуры разлічваюць у 2012 годзе толькі 50 працэнтаў аб'ёмаў будаваць жылля на тэрыторыі нашай краіны, а вось астатняя палова жылля будзе ўзведзена за межамі дзяржавы. Як адгукнецца новая жыллёвая палітыка дзяржавы на канчатковых цэнах на другасным рынку жылля? Зразумела, што такое змяншэнне аб'ёмаў жыллёвага будаўніцтва на тэрыторыі Беларусі праз пэўны час пачне павялічваць колькасць тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. З гэтага боку атрымліваецца, што колькасць патэнцыяльных пакупнікоў кватэр на другасным рынку хутка пачне павялічвацца. Пытанне толькі — калі?

На другасным рынку жылля спрацоўвае яшчэ адзін момант. Калі на рынку не хапае рэальных пакупнікоў кватэр, то ўласнікі могуць не згаджацца на зніжкі, а прытрымаць жыллё да лепшых часоў. Кватэры ў гэтым выпадку пераходзяць на рынак арэнды жылля.

У гэтай сітуацыі цэны на жыллё не павінны хутка вагацца ў той ці іншы бок. Хутчэй за ўсё патанненне, якое існуе, працягнецца і ў першы месяц наступнага года. Разам з тым, зніжэнне такіх цэнаў у доларавым эквіваленце будзе трымацца ў межах 10 працэнтаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

БЕЛАРУСБАНК

**ОАО «АСБ Беларусбанк» сообщает об изменении с 14 декабря 2011 года размеров следующих вознаграждений, взимаемых по операциям с использованием банковских пластиковых карточек банка:**

| | |
|---|---|
| **Международные пластиковые карточки MasterCard (Gold, Standard, Business), VISA (Gold, Classic), VISA Electron, Maestro со счетом в белорусских рублях** | |
| Снятие наличных денежных средств, % от суммы:<br>- в других банках (без учета вознаграждения других банков)<br>- в банкоматах других банков (без учета вознаграждения других банков) | <br>3 (мин. 45 000 бел. руб.)<br>2 (мин. 25 000 бел. руб.) |
| **Пластиковые карточки Maestro, VISA Electron, БелКарт-М (для использования только в Республике Беларусь)** | |
| Перевыпуск карточки в случае ее утери (хищения), изготовление дубликата карточки, бел. руб. | 20 000 |
| Нахождение карточки в стоп-листе независимо от причин, бел. руб. | 8 000 |
| **Пластиковые карточки Maestro, VISA Electron (для использования только в Республике Беларусь)** | |
| Обслуживание карточки в течение срока действия, бел. руб. | 20 000 |
| **Пластиковые карточки БелКарт-М с индивидуальным дизайном** | |
| Оформление карточки, бел. руб.:<br>- со сроком действия 1 год<br>- со сроком действия 2 года | <br>35 000<br>45 000 |

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

## Цэны на новыя аўтамабілі не павінны перавысіць узровень краін-суседак па Мытным саюзе

**НА МІНУЛЫМ ТЫДНІ холдынг «Атлант-М» у Беларусі распаўсюдзіў каментарый гендырэктара кампаніі Сяргея Самойлы аб чутках наконт адмены Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 546 ад 24 лістапада 2005 года «Аб некаторых пытаннях падаткаабкладання транспартных сродкаў». Прадстаўнік аўтамабільнага дылера выказаў занепакоенасць магчымым увядзеннем падатку на дабаўленую вартасць для аўтамабіляў, што ўвозяць на тэрыторыю Беларусі, які тым самым указам адмяняўся. Карэспандэнт «Звязды», зацікавіўшыся, паспрабаваў разабрацца ў гэтым пытанні.**

СТАР. 2



ISSN 1990 - 763X

| Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 09.12.2011 г. (для б/н разлікаў) | | | |
|---|---|---|---|
| 1 долар ЗША | 8 560,00 | 1 чэшская крона | 454,74 |
| 1 еўра | 11 490,00 | 1 польскі злоты | 2 571,00 |
| 1 латвійскі лат | 16 459,96 | 1 расійскі рубель | 274,00 |
| 1 літоўскі літ | 3 327,63 | 1 украінская грыўня | 1 069,20 |

| Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ | |
|---|---|
| USD | 31,2308 |
| 10 UAH | 39,0092 |
| 10000 BYR | 36,5273 |
| EUR | 41,8711 |




Працяг тэмы

**УВАСАБЛЕННЕМ асэнсавання творчасці паэта з'яўляецца энцыклапедыя «Максім Багдановіч», выдадзеная «Беларускай энцыклапедыяй імя Петруся Броўкі». Так супала — яна паспела якраз да юбілею! У Беларусі гэта толькі трэцяя персанальная энцыклапедыя — яшчэ ў савецкія часы былі выдадзены, прысвечаныя Францыску Скарыну і Янку Купалу. Асаблівасць у тым, што ў адной (але вялікай кніжцы) можна знайсці адказы абсалютна на ўсе пытанні, якія задаюцца даследчыкі яго творчасці. Гэта Багдановіч ад «а» да «я». Усё, што вы хочаце пра яго ведаць, пра яго род, пра яго шлях, творы і нават пра тое, як іх успрымалі іншыя, як іх увасаблялі мастакі, — сцвярджаюць тыя, хто непасрэдна працаваў над энцыклапедыяй. Давайце паслухаем — дзеля чаго?**

# І ГЭТА ЎСЁ ПРА ЯГО

## 1. ГІСТОРЫЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫІ

— Усё пачалося ў 1980-я гады, — гаворыць **Ганна МАЛЕЙ, намеснік галоўнага рэдактара выдавецтва «Беларуская экцыклапедыя».** — У 1986 годзе ў нашым выдавецтве загадчыкам рэдакцыі літаратуры, мовы і фальклору быў знакаміты фалькларыст Янка Саламевіч — менавіта ён задумаў стварыць такую энцыклапедыю. Былі прыцягнуты навуковыя кадры, узначальвала гэтую працу Ніна Ватацы. Тады быў складзены слоўнік паводле жыцця і творчасці Багдановіча — у ім было больш чым 2000 тэрмінаў. Давалася тлумачэнне літаратуразнаўчых тэрмінаў, змяшчалася інфармацыя пра родных, знаёмых, нават даваліся спасылкі на тое, дзе ўзгадваецца імя паэта ў літаратуры і мастацтве.

Згадваліся ўсе яго творы — паэтычныя, літаратуразнаўчыя, нататкі, артыкулы і гэтак далей. Слоўнік ахапіў усё, што на той час было вядома пра Багдановіча ў літаратуразнаўстве. Было падрыхтавана 600 артыкулаў. Думалі ажыццявіць выданне да 100-годдзя паэта. Але так атрымалася, што яно прыпынілася больш чым на 25 гадоў. У 2007 годзе адбылася канферэнцыя, прысвечаная Багдановічу, у якой прымалі ўдзел такія вядомыя навукоўцы, як Уладзімір Конан, Віталь Скалабан, супрацоўнікі музея Максіма Багдановіча. Яны вырашылі напісаць ліст у Міністэрства інфармацыі з просьбай звярнуцца да выдання энцыклапедыі «Максім Багдановіч» і давесці справу да завяршэння. Міністэрства інфармацыі станоўча аднеслася да гэтай прапановы, як і наша выдавецтва. Навуковым кіраўніком энцыклапедыі абралі Мікалая Труса, які быў некаторы час дырэктарам музея Максіма Багдановіча. Разам з ім вялікую працу зрабіла Ірына Мышкавец, на той час навуковы сакратар музея. Яна ўзяла за аснову стары слоўнік, разбіла яго па тэматыцы, унесла тэматычныя прапановы ўсіх навукоўцаў — па новых персаналіях, тэрмінах, даследаваннях, якія вяліся па творчасці Максіма Багдановіча. Быў зроблены электронны варыянт ужо агульнага новага слоўніка. Пачалася праца над энцыклапедыяй. Тыя 600 артыкулаў са слоўніка дапрацоўваліся аўтарамі. Артыкулы тых, каго ўжо не было сярод жывых, дасылаліся на рэцэнзаванне. Штосьці дадавалася.

Мы вельмі ўдзячныя за супрацоўніцтва літаратурнаму музею Максіма Багдановіча, Нацыянальнай акадэміі навук (у прыватнасці, Інстытуту мовы і літаратуры), БДУ, Магілёўскаму і Гродзенскаму дзяржаўным універсітэтам. Больш за 100 аўтараў удзельнічала ў гэтай працы. Усё, што было магчыма, што вядома пра паэта на сучасны момант, мы аб'ядналі. Але ж гэта не значыць, што на гэтым трэба раз і назаўсёды ставіць кропку: можна працягваць, шукаць, пераасэнсоўваць яго наступным пакаленням чытачоў і даследчыкаў.

Прыклад: на адной з прэзентацый у бібліятэцы Нацыянальнай акадэміі навук імя Якуба Коласа ўкладальнікаў энцыклапедыі ўразіла выступленне даследчыцы Ірыны Багдановіч. Было цікава пачуць версію пра тое, што апошнім каханнем у жыцці Максіма была Зоська Верас. Такое меркаванне склалася ў даследчыцы пасля дасканалага вывучэння розных запісачак, кавалкаў аркушаў, здымкаў падчас розных вечарын, удзельнікамі якіх былі Багдановіч і Зоська Верас. Гэтыя дробязі прывялі да думкі пра апошняе каханне.

## 2. БЛІЗКАСЦЬ АСОБЫ

**Галоўны рэдактар выдавецтва Ларыса ЯЗЫКОВІЧ:**

— Я не думаю, што мы так ужо змяніліся. Калі ўзгадаць пачатак XX стагоддзя — гэта быў такі інтэлектуальны ўсплёск, калі выспявала нацыянальная ідэя, якую творчая эліта імкнулася сфармуляваць і данесці праз мастацтва. Гэта і нам зразумела. Я не думаю, што мы далёка адышлі ад тых часоў. Але сам Багдановіч настолькі ўнікальная і цікавая постаць, што ён яднае ўсіх: можна і на рускай мове размаўляць пра яго, і па-беларуску, таму што пісаў на дзвюх мовах. У яго цудоўныя пераклады з беларускай мовы на рускую. А з французскай што ён перакладаў! Да гэтай пары мала хто з нашых паэтаў зробіць тое, што ён здолеў да 25 гадоў. Былі нейкія клішэ, якім узнагароджвалі Багдановіча напрыканцы 30-х гадоў: што гэта нейкае дэкадэнства, буржуазнасць. А зараз, наадварот, гэта лічыцца вялікім плюсам: эстэтычныя погляды яго наогул вельмі сучасныя. Калі вершы чытаеш, хочацца перачытваць і зразумець усю глыбіню. А якая ў яго інтымная лірыка! Не ведаю, хто так пранікнёна і тонка пра гэта напісаў — адзінкі беларускіх масцітых паэтаў...

Калі трымаеш у руках новую энцыклапедыю, то хочацца звярнуцца адразу да збору твораў, пачытаць і пацікавіцца: пра што пішуць, што і як каментуюць даследчыкі. Выданне цікавае тым, што карыснае не толькі для навукоўцаў, для студэнтаў, але наогул для тых, хто любіць літаратуру. Артыкулы дапамогуць зразумець сутнасць пошукаў Багдановіча ў галіне формы. Чаму ў яго з'явіліся трыялеты. Ці чаму ён ствараў санеты? Ёсць асобныя артыкулы, якія патлумачаць гэтыя паэтычныя з'явы — у прыватнасці, словамі Вячаслава Рагойшы. На некаторыя тэмы маглі выказацца розныя аўтары, кожны са сваім пунктам гледжання, а чытач можа скласці сваё меркаванне.

Нягледзячы на тое, што энцыклапедыя — асаблівы від выданняў, карыстацца ёю могуць усе. У ёй не надта многа скарачэнняў, каб было больш зразумела для шырокіх колаў. Можа, таму, што гэта справа народная — асэнсоўваць Багдановіча.



## 3. БАГДАНОВІЧА-ЗНАЎСТВА

— Гэта геній, такія нараджаюцца можа раз на сто гадоў, — разважае Ларыса Языковіч. — Я ўпэўнена, што і далей да Багдановіча будуць звяртацца, аналізаваць, з нейкіх іншых пазіцый пераглядаць, нешта новае для сябе знаходзіць. Асэнсаванне яго творчасці пачалося даўно — напэўна, яшчэ ў 20-я гады, калі быў першы збор твораў. Яно і не спынялася з таго часу. Узнікалі новыя падыходы. Тое, што ў грамадстве было галоўным у пэўны перыяд часу, станавілася актуальным і ў багдановічазнаўстве. Гэта даволі папулярная галіна сярод навукоўцаў, ёсць даследчыкі, імёны якіх сталі вядомыя дзякуючы іх працам па творчасці Багдановіча: Ніна Ватацы, Алег Лойка, Ірына Багдановіч. У Вячаслава Рагойшы і Таццяны Кабржыцкай таксама ёсць цікавыя даследаванні. Ёсць аспіранты ў Інстытуце мовы і літаратуры Акадэміі навук, якія сёння працуюць над дысертацыямі па творчасці Багдановіча.

Творчасць нашага паэта вывучаюць і за межамі Беларусі. Віктар Чабаненка — ва Украіне. Наш эмігрант Цімафей Якімовіч (зараз жыве ў ЗША) час ад часу прылятае, каб паўдзельнічаць у беларускіх навуковых канферэнцыях. У энцыклапедыі ёсць праца балгарскай даследчыцы Станкевіч. На нейкім этапе гэта быў міжнародны праект. Як жа інакш, калі творы самога паэта выходзілі за межамі Беларусі?

## 4. МОЎНЫ ПРАЦЭС

Багдановіч — адзін са стваральнікаў літаратурнай мовы, звярнуўся да яе, калі ідэя беларускай дзяржаўнасці набірала моц.

**Ларыса ЯЗЫКОВІЧ:**

— Мова — гэта працэс для яго. Таму што беларускую мову яму давялося вывучаць, і гэта працягвалася да апошняга часу. Значную частку жыцця ён пражыў у Расіі, вядома, пісаў па-руску, рабіў пераклады на рускую. Сям'я жыла ў Расіі, асяроддзе Максіма было рускамоўнае, але ў яго ўзнікла асабістае гарачае жаданне вывучаць родную мову. Таму ў яго творах можна сустрэць словы, якія ў сучаснай літаратурнай беларускай мове не выкарыстоўваюцца, але ў яго вершах гучаць вельмі натуральна — таму што ад сэрца. Шмат твораў, да якіх ён вяртаўся, нешта папраўляў, гэта і для яго быў таксама працэс. Вядома, што ён працаваў да апошняга, вяртаўся да твораў, якія былі выдадзены ў тым жа «Вянку»: у музеі ёсць варыянты з праўкамі.

Напрыклад: вядомы верш «Слуцкія ткачыхі» існуе ў дзвюх рэдакцыях...

**Ганна МАЛЕЙ:**

— У яго было сваё бачанне аднаго і таго ж верша на беларускай мове і на рускай. Ёсць верш Арвера, перайманне з італьянскай: адзін варыянт на рускай мове, другі на беларускай. На беларускай — больш узнёслы. Нібыта чалавеку ўласцівае рознае адчуванне на беларускай мове і на рускай..

## 5. СЭНС ПЕРАКЛАДАЎ

Асобная тэма — пераклады Багдановіча з іншых моў. Нават пераклады Авідзія, Гарацыя рабіў. Але найбольш звяртаўся да перакладаў з французскай — падавалася, яна такая ж мілагучная, як беларуская. Шмат хто можа падзівіцца: навошта было на той час на беларускую мову, якую лічылі сялянскай, перакладаць складаныя рэчы? Быццам бы няўдзячная праца...

— Існавала такая думка, якую ён імкнуўся разбурыць, дзеля чаго і працаваў, — гаворыць Ларыса Языковіч. — Маўляў, сялянская мова, як і народ, які з'яўляецца яе носьбітам. А ён гэткім чынам паказваў, наколькі ўнікальныя прыгожыя рэчы можна ствараць на беларускай мове. Такім чынам і мову, і сам народ ён уздымаў да сусветнага ўзроўню. І дбаў пра нацыянальную эліту, якой даступныя лепшыя ўзоры пісьменства.

## 6. НАТХНЯЛЬНІК МАСТАЦТВА

Можна адчуваць Багдановіча і пісаць пра яго, а можна — маляваць. Яго партрэты, блізкіх яму людзей. Можна ўяўляць яго героя ці ўвасабляць самі вобразы яго твораў. І гэта было: Максім быў і ёсць цудоўны натхняльнік розных відаў беларускага мастацтва. Таму ў энцыклапедыі прадстаўлены асаблівы мастацкі свет, у ёй шмат ілюстрацый, выяў і фотаздымкаў.

— Музей Максіма Багдановіча прадаставіў архіўныя фотаздымкі а таксама інфармацыю пра творы беларускіх мастакоў, ілюстрацыі да яго кніг, зробленыя ў розныя гады, — гаворыць Алеся Коршак, вядучы навуковы рэдактар рэдакцыі літаратуры і мастацтва. — Я звязвалася з самімі мастакамі і пыталася, ці ёсць у іх творы, прысвечаныя Багдановічу. Вялікая частка прац прысвечана вобразу самога паэта. Шмат жывапісных, графічных твораў, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, выкананых у кераміцы, тэкстылі. Шмат скульптур. Паказаны афішкі, лістоўкі, плакаты. Ілюстрацыі розных аўтараў нават да адной кніжкі імкнуліся паказаць (праўда, у розных месцах): напрыклад, шмат мастакоў праілюстравалі кніжку «Мушка-зелянушка і камарык-насаты тварык». Па магчымасці, мы стараліся паказаць усё, што было яму прысвечана, з асобнымі артыкуламі пра кожнага з творцаў. Для мяне многія творы былі сапраўдным адкрыццём. І тут, дарэчы, вялікая заслуга юбілейных дат: большая частка твораў былі прысвечаны юбілеям, якія адзначаліся ў 81-м і 91-м гадах.

У Нацыянальнай бібліятэцы была выстава твораў, прысвечаных Багдановічу. І ў гэтыя дні беларускія мастакі дораць паэту сваю выставу ў Палацы мастацтваў. Максім — прыгожы, рамантычны беларус, яго творчасць невычарпальная...

Нездарма і нашы літаратары прысвячаюць яму свае літаратурныя творы, празаічныя і вершаваныя. А кампазітары пісалі музыку, натхняючыся яго радкамі. Ёсць нават оперы, а не толькі вядомыя ўсім песні. Пра гэта таксама можна даведацца з энцыклапедыі.

## 7. ГОНАР НАЦЫІ

**Таццяна РОСЛІК, загадчык рэдакцыі літаратуры і мастацтва:**

— Самае галоўнае ў нашай працы тое, што ў нашых дзяцей ёсць магчымасць ведаць Багдановіча не толькі як аўтара «Слуцкіх ткачых», «Пагоні», «Зоркі Венеры». Гэта грунтоўная, сумленная праца: каля 2000 артыкулаў — увесь Багдановіч. Калі хтосьці захоча дасканала вывучыць яго творчасць, то гэтае наша выданне будзе падмуркам, добрым дапаможнікам. Такое выданне, прысвечанае паэту, стварае гонар нашай нацыі.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## У Беларусі разглядаецца пытанне аб увядзенні платы за дарогі першай катэгорыі

**У Беларусі прапрацоўваецца пытанне аб збіранні платы за карыстанне дарогамі першай катэгорыі. Пра гэта паведаміў намеснік міністра транспарту і камунікацый — дырэктар дэпартамента «Белаўтадар» Анатоль Лыцін на пасяджэнні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта, на якім разглядалася рэалізацыя праграмы «Дарогі Беларусі» на 2006—2015 гады, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

На першым этапе платнай стане дарога Мінск—Гомель, рэканструкцыя якой вядзецца з прыцягненнем пазыкі Сусветнага банка. Праектам плануецца ўкараненне сістэмы збірання платы. Мяркуецца, што яна будзе бесперапынная. «Не будзе будак і калонак, а як у Аўстрыі, Чэхіі, Славакіі — адмысловыя вароты, якія пракантралююць наяўнасць аплаты як мінімум праезду грузавога транспарту. Магчыма, і кіроўцы легкавых аўтамабіляў, заплаціўшы вызначаную суму, змогуць атрымаць віньетку на транспарт. Віньеткі змогуць выдавацца на розны тэрмін — на дзень, на тыдзень, месяц, квартал, год».

Пакуль у Беларусі ёсць толькі адна платная дарога — М-1/Е-30, хоць быў перыяд, калі аўтааматары і прадпрыемствы плацілі дарожны збор. «Сёння за карыстанне дарогамі ніхто не плаціць, але з часам аплата будзе. Гэта адна з крыніц фінансавання рамонту і ўтрымання дарог. Спачатку апрабуем схему на дарозе Мінск—Гомель, затым — на дарогах першай катэгорыі.

**БЕЛТА.**

Здарэнне

## ПАЖАР У БЫТОЎЦЫ

**У бытавым памяшканні ААТ «Лідскае піва» адбыўся пажар.**

Здарылася гэта позна ўвечары. Бытоўка памерамі 4х6 метраў была прыбудавана да аднапавярховага будынка цэха № 3. У апошнім праводзіцца разліў квасу ў поліэтыленавую тару. Праўда, у зімовы час цэх не эксплуатуецца. Мяркуецца, што пажар у бытоўцы адбыўся з-за неасцярожнасці пры курэнні. Вінаватая асоба ўстанаўліваецца. Пашкоджанымі аказаліся адзенне і асабістыя рэчы работнікаў прадпрыемства, само памяшканне бытоўкі. Пацярпелых не было, тэхналагічны працэс не прыпыняўся. Матэрыяльных каштоўнасцяў было выратавана на 10 мільёнаў рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# НЯДЗЕЛЯ, 18 СНЕЖНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**7.15 Кінааповесць «Бальная сукенка».**
**8.30** «Усё як трэба!».
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Арсенал.
**9.40** Урачэбныя тайны.
**10.15** Да цешчы на бліны.
**10.50 «Сваты. Жыццё без грыму». «Кіно пра кіно».**
**12.10 Камедыя «Гусарская балада».**
**14.05** М/ф.
**14.15** Клуб рэдактараў.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Зямля беларуская». «Гісторыя па крупінках».
**15.45** «У пошуках скарбаў». «Падводныя лодкі».
**16.35 Камедыя «Прыезджыя».**
**18.20** Суперлата.
**19.05 Баявік «Смокінг».**
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55 «Еўрафэст». Відэадзённік.**
**22.10 Меладрама «Апошні шанс Харві».**

### АНТ

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00, 9.00, 16.00** (з субцітрамі) Нашы навіны.
**9.05** Нядзельная пропаведзь (з субцітрамі).
**9.20 Серыял «Мая жонка мяне прываражыла».**
**9.55** «Бесталковыя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.10** Фазэнда.
**11.45** «Брэйн-рынг».
**12.50** Усе хіты «Гумар FM».
**14.15 Маст. фільм «Два дні».**
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Асяроддзе пражывання.
**17.20** «Эстрадны кактэйль».
**18.25** «Бітва тытанаў». Фінал.
**20.00** Контуры.
**21.05** «Дыханне планеты».
**21.40** Юрыю Нікуліну — 90! Юбілейны вечар.
**23.15** «Чырвоная зорка».
**0.25 Камедыя «Старыя разбойнікі».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.45 Камедыя «Жаніцьба Бальзамінава».**
**9.20** Прыступкі Веры.
**9.35** Таямніцы Душы.
**10.00** Цела чалавека.
**10.45** Тэлебарометр.
**10.50** Еш і худзей.
**11.25** Школа рамонту.
**12.35** Інтуіцыя.
**13.45 Камедыя «Прышэльцы».**
**15.50** Кінапробы.
**16.25** Біятлон. Кубак свету. Змешаная эстафета.
**18.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Агляд тура.
**19.10** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Манчэстэр Сіці» — «Арсенал».
**21.10** Спортлато 5 з 36.
**21.15** КЕНО.
**21.20** Навіны надвор'я.
**21.55 Камедыя «Асляплены жаданнямі».**
**23.45** Баскетбол. Адзіная Ліга ВТБ. «Мінск-2006» — «Німбурк».
**1.30** Гандбол. Чэмпіянат свету. Жанчыны. Фінал.

### СТБ

**7.15 «Салдаты. Дэмбельскі альбом». Серыял.**
**9.00** «Аўтапанарама».
**9.30** «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
**10.20** «Вялікае снеданне».
**11.00 Драма «Сакрэты Лос-Анджэлеса».**
**13.30** «Добы дзень, доктар».
**14.05 Меладрама «Адзінокім даецца інтэрнат».**
**15.45** Ток-шоу «Такі лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Праўда».
**17.30** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень».
**20.40 Маст. фільм «Мяжа. Таежны раман».**
**23.15** Прафесійны бокс.
**0.15 Маст. фільм «Ваенны рэквіем».**

### МІР

**5.00** Дак. фільм «Юрый Нікулін: Я нікуды не з'еду».
**5.50** Смачны свет. Малдаўская кухня.
**6.20, 3.40 Маст. фільм «Дыпламаты міжволі».**
**7.40** «Эксперыментатары».
**7.55** М/с «Прыгоды Мумі Троля».
**8.20** «Давайце маляваць!».
**8.40** «Спытай ва Усёведа».
**9.00, 15.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**9.10** «Ведаем рускую».
**10.05 Серыял «Восеньскі дэтэктыў».**
**13.00, 2.50** «Доказы віны».
**14.00, 2.00** «Правілы жыцця».
**15.10** Канцэрт «Музычны калейдаскоп».
**16.30** «Простыя лічбы. Ясна бачанне: сляпыя і відушчыя».
**17.00 Серыял «Каханне і іншыя глупствы».**
**20.00** «Разам».
**21.00 Маст. фільм «Радня».**
**22.50** «Паўночнікі».
**23.20 Маст. фільм «Прывід оперы».**
**1.10** «Навіны Садружнасці (бягучы радок). Культура».

### 8 КАНАЛ

**9.00, 12.55, 18.45, 21.00, 23.50** «Надвор'е».
**9.05** Мультпарад.
**9.30** «Мой любімы гадаванец».
**10.00** «Кінаблакнот».
**10.20** «Адшукваецца адпачынак».
**10.50 Трылер «Выкуп».**
**13.00 Камедыя «Ружовая пантэра».**
**15.15** Фільм для дзяцей.
**17.15** «Бульбокс».
**17.45 Серыял «Думаць як злачынец».**
**18.50, 23.45** «Інэт».
**18.55 Серыял «Каломба».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05** Прыгоды «Майстэрства падарожнічаць».
**23.00 Серыял «Уцёкі».**

### ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.00 Серыял «Цацкі».**
**9.00** «Адны дома».
**9.30** «Гэта маё дзіця».
**10.30** Шоу «Уральскія пельмені».
**12.00, 0.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**13.00 Серыял «Я лячу».**
**15.00, 23.00 Серыял «Галыгін.ру».**
**16.00** Шоу «Дзякуй Богу, ты прыйшоў!».
**17.30 Серыял «Варонін».**
**20.00** Шоу «Смех у вялікім горадзе».
**21.00** «Добрыя жарты».
**0.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** М/ф.
**7.15** «ХА».
**7.40 Маст. фільм «Дом без выхаду».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
**12.35 Маст. фільм «Губернатар».**
**14.15** «З новым домам!».
**14.45** «Абмянялі хулігана на Луіса Карвалана...».
**15.45** «Гарадок».
**16.15 Камедыя «Сем старых і адна дзяўчына».**
**17.55** «Смяяцца дазваляецца».
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** «Стылягі-шоу».
**23.00** «Спецыяльны карэспандэнт».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**7.10 Серыял «Марскія д'яблы».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**8.20** «Першая перадача».
**8.45** «Іх норавы».
**9.25** «Ядзім дома!».
**10.20** «Увага: вышук!».
**10.55** «Дачны адказ».
**12.00** «Развод па-руску».
**13.20 Серыял «Дарожны патруль-4».**
**15.05** «ГРУ. Тайны ваеннай разведкі». «Загадка Рэслера. Агент усіх разведак».
**16.20** «Следства вялі...».
**17.20** «І зноў прывітанне!».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** «Сёння. Падагульняючая праграма».
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.50** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**21.55** «Тайны шоу-бізнэс».
**23.00** «НТБшнікі».
**0.00 Маст. фільм «Прыстанак».**

### ІНТЭР+

**8.40** Самы разумны.
**10.05** Па слядах продкаў.
**10.30** Школа доктара Камароўскага.
**11.00** Ранішняя пошта.
**11.30** Смачная ліга.
**12.15** Арол і рэшка.
**13.00** Разбор палётаў.
**13.45** Купаж.
**13.55, 23.05 Маст. фільм «Вялікае золата містэра Грынвуда».**
**15.05 Маст. фільм «Трэмбіта».**
**16.30, 6.05** Вячэрні квартал.
**19.05, 2.05** Легенды крымінальнага вышуку.
**19.35, 2.35 Маст. фільм «Сувенір для пракурора».**
**21.00, 4.00** Падрабязнасці тыдня.
**21.45, 4.45 Маст. фільм «Пацучыны кут».**
**0.20 Маст. фільм «Толькі ўдваіх».**
**1.35** Праверана на сабе.
**6.50** Канцэрт ансамбля «Горліца».

### КУЛЬТУРА

**5.30** «Еўраньюс» на рускай мове.
**9.00** 90 гадоў з дня нараджэння артыста. «Юрый Нікулін. Выбранае».
**9.35 «Цыганскі барон». Маст. фільм.**
**10.55** «Сусветныя скарбы культуры».
**11.10** «Легенды сусветнага кіно». Леанід Гайдай.
**11.35 «Том Соер». Маст. фільм.**
**12.55** «Спісы Уоліса». «Ліса і мядзведзь». М/ф.
**13.20, 0.55** «Тайнае жыццё мышэй». Дак. фільм.
**14.10** «Што рабіць?».
**15.00** «У гонар Алісіі Алонса». Гала-канцэрт Нацыянальнага балета Кубы.
**16.05** «Месцы і главы жыцця цэлага... Валянцін Плучак».
**17.00** «Шукальнікі». «Нямецкія тайны рускага горада».
**17.50 «Старыя сцэны». Маст. фільм.**
**19.20** «Уся Расія». Фальклорны фестываль тэлеканала «Культура».
**21.00** «Кантэкст».
**21.40 «Пралятаючы над гняздом зязюлі». Маст. фільм.**
**0.05** «Джэм-5».
**1.50** «Гюстаў Курбэ». Дак. фільм.

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Бывай, стары цырк». Дак. фільм.
**6.40, 0.40 «Мяжа магчымага». Маст. фільм.**
**8.00, 14.00, 2.00** «Мінулы час».
**9.00** «Колба часу».
**10.00** «Кінапанарама». 1991 год.
**11.00** «Да і пасля...».
**12.00** «Поспех». Кароткаметражны фільм.
**12.20** «Навагоднія міражы». 1991 год.
**13.00** «Шынок 13 крэслаў». 1969 год.
**15.00 «Нос». Маст. фільм.**
**16.40** «Сатырычны прагноз». 1992 год.
**17.00** «Шырэй круг». 1990 год.
**18.00, 3.00** «Народжаны ў СССР».
**19.00** «Вакол смеху». 1989 год.
**21.00** «Тэатральныя сустрэчы». 1964 год.
**22.15** «Па старонках амерыканскага кіно». Кінаканцэрт. 1991 год.
**23.00** «Будзільнік». 1979 год.
**23.40** «У афішах не значацца». Дак. фільм.
**4.00** «Погляд». 1988 год.

### MTV

**5.00, 2.05** Music.
**6.00** Стэрэа_раніца.
**8.45** «Губка Боб». М/ф.
**10.00** News блок Weekly.
**10.30** Ікона відэагульняў.
**11.00** «13 кіналаж».
**11.30, 20.50** Трэндзі.
**12.00** MTV Special.
**13.00, 17.00** Шопаголікі.
**14.00** «Канікулы ў Мексіцы».
**18.00** Праверка чутак.
**18.30** Зоркі на далоні.
**19.00 «Клуб». Серыял.**
**21.20** Тачку на пракачку.
**21.45** Тайн.net.
**22.45** World Stage.

### ФІЛЬМ ДНЯ

**22.10**

**«АПОШНІ ШАНЦ ХАРВІ»**

**(ЗША—ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ, 2008 г.)**

На вяселлі дачкі ў Лондане адзінокі мужчына-кампазітар знаходзіць новае каханне.

**Рэжысёр** — Джоэл Хопкінс. **У ролях:** Дасцін Хофман, Эма Томпсан, Кейт Бейкер, Джэймс Бралін.



### НАША КІНО

**6.30, 12.30** Кінафарс «Бакенбарды».
**8.30, 14.30** Меладрама «Салодкая жанчына».
**10.30, 16.30** Маст. фільм «Узброены і вельмі небяспечны».
**18.30, 0.30** Меладрама «Калі дрэвы былі вялікімі».
**20.30, 2.30** Маст. фільм «Патрэбныя людзі».
**22.30, 4.30** Меладрама «Дзікае каханне».

### ДОМ КІНО

**3.00, 12.00, 19.10** Серыял «Таццянін дзень».
**3.50** Сусветная прэм'ера. Ваенная драма «Ніхто, акрамя нас...».
**5.40** Камедыя «Ход канём».
**7.00** Меладрама «Дробязі жыцця».
**8.10** Мюзікл па-руску. «Вольны вецер».
**10.20** Экранізацыя школьнай праграмы. А. Платонаў. «Іван Вялікі».
**12.45** Камедыя «Апякун».
**14.10** Іранічны дэтэктыў «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышуку-2: Надзіманая жанчына для Казановы».
**17.35** Новы хіт. Меладрама «Гульня ў хованкі».
**20.00** Золата «Масфільма». «Той самы Мюнхгаўзен».
**22.15** Новы хіт. Меладрама «Прагулка па Парыжы».
**23.40** Камедыя «Паездка праз горад».
**0.50** Музычны фільм «Загадка Кальмана».

### ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

**5.00, 9.00, 13.00** Фільм-казка «Юнацтва Бэмбі».
**6.10, 10.10, 14.10** М/с «Малпачкі ў оперы». М/ф: «Падарожжа мураша», «Як казакі мушкецёрам дапамагалі», «Раз-гарох, два-гарох...».
**7.00, 11.00** Маст. фільм «Ішоў сабака па раялі».
**8.05, 12.05** Казкі замежных пісьменнікаў. «Шчаўкунок». М/ф: «Тры мяшкі хітрасцяў», «Які гук выдае камар?».
**15.00** Фільм-казка «Вучань лекара».
**16.10** М/с «Незвычайны матч». Казкі Пушкіна. «Казка пра папа і пра работніка яго Балду».
**17.00** М/ф: «Ідзі туды — не ведаю куды», «Вясёлыя карцінкі».
**18.00** Казкі замежных пісьменнікаў. «Зачараваны хлопчык».

### ТЭЛЕКЛУБ

**19.00, 1.00** Серыял «Мент у законе».
**20.00, 2.00** Серыял «Пятая група крыві».
**21.00, 3.00** Серыял «Бандыцкі Пецярбург».
**22.00** Серыял «Джэк Васьмёркін — «Амерыканец».
**23.30** Серыял «Чырвонае і чорнае». 1-я серыя.

### ТБ3

**5.00** Маст. фільм «Каралі і капуста». 2-я серыя.
**6.30** М/ф «Паляўнічыя на прывідаў».
**7.00** «Сябры анёлаў».
**7.30** М/с «Братц».
**8.00** М/ф «Бакуган».
**8.30** М/ф «Генератар Рэкс».
**9.00** Маст. фільм «Рокі Бальбоа».
**11.00** Здзіві мяне.
**12.00** Дак. фільм «Звышлюдзі сярод нас».
**13.00** Маст. фільм «Анатамiраванне іншапланецяніна».
**14.45** Маст. фільм «Уладар пярсцёнкаў: Брацтва пярсцёнка».
**18.15** Маст. фільм «Практычная магія».
**20.15** Маст. фільм «Працяглы пацалунак на ноч».
**22.45** Дак. фільм «Эфект Настрадамуса».
**23.30** Маст. фільм «Груз».
**1.45** Маст. фільм «Герой месяца».
**3.45** Серыял «Мечаны».
**4.30** М/ф.

### ТБ-21

**9.00, 17.00, 1.00** Серыял «Наваро».
**10.40, 18.40, 2.40** Камедыя «Піцер FM».
**12.15, 20.15, 4.15** Меладрама «Закаханыя».
**13.45, 21.45, 5.45** Камедыя «Адзінокі Джым».
**15.20, 23.20, 7.20** Драма «Мэрылін і Бобі — яе апошняе каханне».

### ТБ1000

**3.00, 20.50** Трылер «Запаведная дарога».
**4.50** Камедыя «Пасля прачытання спаліць».
**6.40** Камедыя «На цвярозую галаву».
**8.50** Камедыя «Законы прывабнасці».
